ГАРАСКОП СТРЫЖАК НА СНЕЖАНЬ

2 снежня, *пятніца*. Не лепшы час для стрыжкі, яна будзе не такая добрая, як чакаеце.

3 снежня, *субота*. Сёння лепш не хадзіць да цырульніка. Змены будуць зусім не такімі, як вы спадзеяцеся.

4 снежня, *нядзеля*. Эксперыментуйце, робячы самыя незвычайныя прычоскі. А вось простую стрыжку рабіць не рэкамендуецца. Яна будзе няўдалай, а валасы страцяць сілу, стануць непаслухмянымі, могуць пачаць выпадаць.

5 снежня, *панядзелак*. Стрыжка палепшыць стан здароўя і прыцягне багацце.

6 снежня, *аўторак*. Стрыжка можа прывесці да з'яўлення перхаці.

7 снежня, *серада*. Стрыгчыся непажадана. Валасы могуць пазбавіцца здароўя і добрага выгляду, пачнуць выпадаць.

8 снежня, *чацвер*. Дзень спрыяльны для стрыжкі. Яна дапаможа пазбегнуць розных непрыемнасцяў, недамаганняў.

9 снежня, *пятніца*. Сёння лепш не стрыгчыся, інакш у валасоў могуць пачаць секчыся кончыкі.

10 снежня, *субота*. Стрыжка дапаможа паляпшэнню самаадчування і абароніць ад адмоўнай энергіі.

11 снежня, *нядзеля*. Калі заняцца валасамі ў гэты дзень, то яны набудуць сілу, перастануць выпадаць.

12 снежня, *панядзелак*. Абразанне валасоў спрыяе ўмацаванню здароўя.

13 снежня, *аўторак*. Стрыжка дапаможа валасам расці хутчэй, але яны будуць непакорныя расчосцы.

14 снежня, *серада*. Укарочванне даўжыні валасоў можа адмоўна паўплываць на здароўе. Каб атрымаць зарад энергіі — выпрастайце валасы.

15 снежня, *чацвер*. Стрыгчыся варта, калі хочаце ліквідаваць увагу з боку назойлівых сваякоў або самі жадаеце перастаць занадта апекаваць каго-небудзь.

16 снежня, *пятніца*. Рабіце стрыжку, калі задумалі значныя перамены.

17 снежня, *субота*. Выдатны час, каб адправіцца ў салон. Стрыжка дапаможа валасам стаць больш густымі, вам стаць больш энергічнымі, прыцягне ўдачу.

18 снежня, *нядзеля*. Стрыжыцеся, калі хочаце прыцягнуць энергію і поспех.

19 снежня, *панядзелак*. Стрыжка захавае форму на большы тэрмін без сечаных кончыкаў, дазваляючы валасам атрымаць новую сілу.

20 снежня, *аўторак*. Нейтральны для стрыжкі дзень.

21 снежня, *серада*. Змена прычоскі станоўча адаб'ецца на здароўі, асабліва на лёгкіх. Але не адстрыгайце шмат, бо валасы не будуць хутка расці.

22 снежня, *чацвер*. Лепш адмоўцеся ад наведвання цырульніка, калі не хочаце прыцягнуць непрыемнасці. Калі вы рашыліся, то не рабіце вельмі кароткую стрыжку.

23 снежня, *пятніца*. Новая стрыжка будзе актуальная, яна прыцягне станоўчую энергію, ды і прычоска захаваецца надоўга.

24 снежня, *субота*. Змена прычоскі паўплывае на адносіны з процілеглым полам, але вось у які бок — невядома.

25 снежня, *нядзеля*. Падстрыгчыся варта ўладальніцам аслабленых і рэдкіх валасоў, яны пасля паходу да майстра стануць выглядаць значна лепш.

26 снежня, *панядзелак*. Калі ёсць жаданне захаваць прычоску на працяглы час, то не хадзіце да цырульніка. Валасы пасля абнаўлення імгненна адрастуць, а вось паслухмянасцю адрознівацца не будуць.

27 снежня, *аўторак*. Укарочванне даўжыні валасоў станоўча адаб'ецца на вашым даўгалецці і фізічнай актыўнасці. Прычоску выбірайце немудрагелістую, каб прыцягнуць энергію прыроды.

28 снежня, *серада*. Паход да стыліста дасць шанц самасцвярдзіцца, стаць больш упэўненымі. Кароткія стрыжкі варта выбраць тым, хто плануе змяніць жыццёвыя прынцыпы.

29 снежня, *чацвер*. Не лепшы час для новаўвядзенняў. Старажытныя легенды кажуць: колькіх валасоў пазбавіцца чалавек у гэты дзень, настолькі і скароціцца яго жыццё.

30 снежня, *пятніца*. Стрыжка будзе спрыяць росту валасоў, прыцягне энергію здароўя, што прывядзе да абнаўлення ўсяго арганізма.

31 снежня, *субота*. Дзень падыходзіць для эксперыментаў з незвычайнымі варыянтамі. Паход да стыліста прыцягне матэрыяльную энергію.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	9.07	16.51	7.44
Віцебск —	9.03	16.34	7.31
Магілёў —	8.57	16.41	7.44
Гомель —	8.45	16.45	8.00
Гродна —	9.21	17.08	7.47
Брэст —	9.13	17.16	8.03

Месяц

Маладзік 29.11—06.12.
Месяц у сузор'і Казярога.

Імяніны

Пр. *Аляксандра, Валянціна, Васіля, Дзмітрыя, Канстанціна, Міхаіла, Сяргея.*
К. *Альбіны, Паўліны, Пятра, Яна.*

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

ЗАЎТРА



Даты Падзеі Людзі

2 СНЕЖНЯ

1776 год — нарадзіўся (маёнтак Юркаўшчына, цяпер у Мсціслаўскім раёне) Анёл Доўгірд, філосаф, логік і псіхолаг. У 1818—1832 гадах — прафесар філасофіі і логікі Віленскага ўніверсітэта. Лічыў, што Сусвет, аднойчы створаны Богам, падпарадкоўваецца натуральным законам. Аўтар работ «Аб філасофіі», «Аб логіцы, метафізіцы і маральнай філасофіі», «Рэчаіснасць чалавечых ведаў» і іншых. Крытыкаваў філасофію Канта, лічыў паэзію галоўным жанрам мастацтва. Памёр у 1835 годзе.

1805 год — адбылася Аўстэрліцкая бітва («бітва трох імператараў»). Кутузаў быў яе праціўнікам: расійскі камандуючы прапаноўваў, наадварот, адступленне, каб заваблівацьфранцузаў на ўсход і яшчэ больш расцягнуць іх камунікацыі, выйграючы па ходзе справы ад прыбыцця новых падмацаванняў. Аднак малады імператар Аляксандр I і яго атачэнне марылі аб неадкладнай баявой славе. Цар прыняў план аўстрыйскага генерала Вейротэра, які хацеў як мага хутчэй вызваліць Вену ад французаў, і настаяў на пераходзе ў рашучае наступленне. Праект Кутузава быў адхілены, і саюзнае войска рушыла насустрач арміі Напалеона. Саюзнікі пацярпелі поўнае паражэнне. Яны страцілі 27 тысяч чалавек (трэць сваёй арміі).

У баі быў паранены Кутузаў. Страты французаў склалі 12 000 чалавек.

1902 год — нарадзіўся (станцыя Пухавічы, цяпер у Пухавіцкім раёне) Анатоль Вольны (Анатоль Іўсцінавіч Ажгірэй), беларускі паэт, празаік, кінадраматург. Заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі (1935). Адзін з заснавальнікаў літаратурнай арганізацыі «Маладняк». Аўтар прыгодніцкай аповесці «Два», аповесці «Антон Савіцкі», кнігі фельетонаў «Суседзі». Па сцэнарыях Анатоля Вольнага пастаўленыя фільмы «Сонечны паход», «Новая радзіма», «Шасцідзясятая паралель» і інш. У 1936 годзе быў арыштаваны, у 1937-м расстраляны. Рэабілітаваны пасмяротна ў 1957 годзе.

1917 год — у Магілёве ліквідаваная Стаўка Вярхоўнага галоўнакамандуючага; 2 снежня Магілёўскі ваенна-рэвалюцыйны камітэт узяў Стаўку пад свой кантроль; а 3 снежня яе занялі рэвалюцыйныя войскі на чале з прапаршчыкам Крыленкам, які быў прызначаны галоўнакамандуючым замест забітага салдатамі генерала Духоніна.

1956 год — на Кубе з маленькай прагулачнай яхты «Гранма» высадзіліся 82 узброеныя рэвалюцыянеры на чале з маладым адвакатам Фідэлем Кастра. Менавіта з гэтага дня на Кубе пачаўся вызваленчы рух супраць рэжыму дыктатара Батысты.

Было сказана

Алесь ПІСЬМЯНКОЎ, паэт:
«Хай душа баліць,
Хай ачысціць яе боль».

УСМІХНЕМСЯ

— Дарагі, што б ты хацеў памяняць у нашых адносінах?

— Ну, хацелася б часцей і бясплатна.

Тарнада, які выбіў усе шыбы ў будынку Гідраметэацэнтра, як бы намякнуў яго супрацоўнікам, што сёння не зусім «сонечна і пераважна без ападкаў пры слабым паўднёва-заходнім ветры».

Дзеці — кветкі жыцця :) Дачка задала пытанне:

— А Царэўна Лебедзь, калі зацяжарыць, знясе яйка ці народзіць дзіця?

Дзве ночы заснуць не магу...

Парада ўсім, хто ставіць суп на пліту і ідзе да камп'ютара: бярыце з сабой лыжку. Гэты прадмет нагадае вам, што вы нешта гатуеце.

Малюнак Аляксандра КАРШАКЕВІЧА.

НЕСПРЫЯЛЬНЫЯ ДНІ І ГАДЗІНЫ Ў СНЕЖНІ

3, субота, 6.00 – 11.00
5, панядзелак, 14.00 – 24.00
6, аўторак, 0.00 – 6.30
7, серада, 16.00 – 24.00
8, чацвер, 0.00 – 12.30
10, субота, 3.00 – 14.30
12, панядзелак, 6.00 – 15.00
14, серада, 8.00 – 14.00
15, чацвер, 23.00 – 24.00
16, пятніца, 0.00 – 15.30
18, нядзеля, 19.00 – 20.00
21, серада, 4.00 – 4.30
22, чацвер, 22.30 – 24.00
23, пятніца, 0.00 – 16.30
25, нядзеля, 9.30 – 24.00
26, панядзелак, 0.00 – 5.30
28, аўторак, 3.30 – 17.30

Зялёная вада — гэта нармальна

У Мінску афарбоўваюць гарачую ваду

Правядзенне спецыяльных работ закране толькі зону цеплазабеспячэння кацельні «Кедышка», ад якой гарачая вада паступае да спажыўцоў з Савецкага і Першамайскага раёнаў. У ваду ўводзіцца флуарасцэнін, дзякуючы якому яна атрымлівае бледна-зялёнае адценне. Гэта дазволіць аператыўна выявіць уцечкі і нямэтавае выкарыстанне цепланосьбіта, а таксама няшчыльнасць воданагравальнікаў. Прымяненне рэчыва ажыццяўляецца ў адпаведнасці з гігіенічнымі патрабаваннямі: фарбавальнік не ўяўляе небяспекі для арганізма чалавека. Пры знаходжанні ўцечак гарачай вады ці выяўленні лужын светла-зялёнага колеру, а таксама пры характэрным афарбоўванні гарачай вады філіял «Мінскія цеплавыя сеткі» просіць інфармаваць па тэлефонах: 218-27- 52; 298-27-27; 298-27-37. Мерапрыемства будзе праводзіцца ў перыяд з канца лістапада 2016-га па красавік 2017 года.

Дар'я КАСКО. *kasko@zviazda.by*

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК (намеснік галоўнага рэдактара).

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 284 44 04, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.023. Індэкс 63850. Зак. № 4675. Нумар падпісаны ў 19.30 1 снежня 2016 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12